**УДК 94(476)“9”**

# СТАНАЎЛЕННЕ ЎЛАДЫ РАГВАЛОДА Ў СІСТЭМЕ САЦЫЯЛЬНЫХ АДНОСІН ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ

***Ю.М. КЕЖА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аналізуюцца асаблівасці ўсталявання ў Полацку ўлады скандынаўскага правадыра Рагвалода (сярэдзіна X ст. – 978 г.). Робіцца выснова, што Рагвалод быў запрошаны ў Полацк прадстаўнікамі мясцовых эліт у сярэдзіне X ст. Фактарамі ўкняжэння Рагвалода было выкананне ім функцый кантролю над сярэднедзвінскім гандлёвым маршрутам “з вараг у грэкі” і абароны дадзенай тэрыторыі ад знешняй пагрозы. Пад уладай Рагвалода ў другой палове X ст. апынуліся тэрыторыі ад Браслаўскага Паазер’я да Лукомля і Друцка, з насельніцтвам гэтых тэрыторый былі ўсталяваны падаткова-данніцкія адносіны.*

***Ключавыя словы***: *Рагвалод, Полацкая зямля, укняжэнне.*

**Уводзіны.** Перыяд IX–X стст. на землях Усходняй Еўропы з’яўляецца пераходным этапам ад родаплемянных структур да раннесярэднявечных дзяржаўных утварэнняў [1, с. 31]. У гэты перыяд назіраюцца змены і трансфармацыі сацыяльных інстытутаў раннесярэднявечнага грамадства. Разам з новымі ўмовамі функцыянавання інстытутаў улады змяняецца характар улады князя.

У дадзяржаўным перыядзе развіцця насельніцтва Усходняй Еўропы патэстарна-палітычныя структуры, якія канцэнтравалі ў сваіх руках кіраўніцтва над грамадствам, у сацыяльнай антрапалогіі атрымалі назву “chefdom” (“правадырства”) [2, с. 57], у сувязі з іх палітычным ладам, дзе важную ролю ў грамадскім жыцці адыгрываў інстытут правадыра і дружыны. Дадзеная форма грамадскага кіраўніцтва з’яўляецца прамежкавым звяном паміж родапляменным ладам і дзяржаўнымі ўтварэннямі [3, с. 15–16]. Аб значным статусе князя (правадыра) у грамадстве пры пераходзе ад родапляменнага ладу да дзяржаўных арганізацый сведчыць этымалогія гэтага тэрміну. Зыходзячы са значэнняў, слова “князь” ў заходнеславянскіх мовах (славацк. knaz; польск. ksiadz – “святар”), вынікае, што князі выконвалі не толькі свецкія, але і святарскія функцыі [4, с. 58].

Акрамя ўлады правадыра (князя), на апошнім этапе развіцця родапляменнага грамадства вылучаюцца такія сацыяльныя інстытуты, як савет старэйшын і народны сход (веча). Наяўнасць улады князя як ваеннага кіраўніка сведчыць аб наяўнасці бліжэйшага княжацкага атачэння (дружыны) [5, с. 17]. Пры гэтым, акрамя племянной княжацкай улады, вялікую ролю ў жыцці грамадства адыгрывалі прадстаўнікі набілітэту (племяннное баярства) [6, с. 157–158]. Аб эканамічнай і сацыяльнай магутнасці племяннога баярства сведчаць зямельныя надзелы гэтай сацыяльнай групы, якія з’явіліся раней, чым іх атрымалі князі, якія ўзначальвалі пазнейшыя дзяржаўныя ўтварэнні [7, с. 382].

Асноўным паказчыкам сацыяльнага развіцця грамадства з’яўляецца ступень функцыянальнай дыферынцыяцыі, якая трансфармуецца ў сацыяльную і маёмасную дыферынцыяцыю [8, с. 20]. Як адзначае Э. Сэрвіс, «лік статусаў павышанай каштоўнасці абмежаваны так, што далёка не ўсе хто валодае здольнасцю займаць дадзены статус маюць яго» [3, с. 21–34]. Пасля развіцця трансеўрапейскіх гандлёвых шляхоў вышэйшыя сацыяльныя структуры набываюць функцыю ўплыву над пераразмеркаваннем залішняга прадукту, які накопліваецца ў выніку кантролю над шляхамі гандлю і спагнання даніны з падуладнага насельніцтва. Адной з асноўных сацыяльных з’яў гэтага перыяду з’яўляецца інстытут палюддзя [9].

Пачатак палюддзя як сістэматычнага збору даніны трэба шукаць у перыядзе ўтварэння племянных княстваў (VIII–IX стст.). Пры гэтым дадзены інстытут непасрэдна звязаны са станаўленнем правадырства, а ў ходзе далейшай эвалюцыі грамадства з інстытутам вярхоўнай княжацкай улады [10, с. 108]. Палюддзе ўзнікла як “грамадска неабходны і грамадска карысны інстытут, які забяспечваў нармальнае функцыянаванне ўлады князя, і, такім чынам соцыўма ў цэлым” [11, с. 468]. Вытокі палюддзя ў племянным грамадстве непасрэдна выцякаюць з успрыняцця падуладным насельніцтвам дара. Князь, які з’яўляўся сакральным і фізічным гарантам міру і дабрабыту, патрабаваў ад насельніцтва адказнага дара [5, с. 18]. Падданыя, з якіх збіралася даніна, запрашалі правадыроў на піры, адорвалі іх з надзеяй на падтрымку і адказныя дары [12, с. 234]. Такім чынам, уладар атрымліваў добраахвотныя дары ад славянскіх плямёнаў, якія разлічвалі на тое, што ён будзе выконваць асноўныя грамадскія функцыі: абарону ад знешняй агрэсіі і ўнутранае кіраванне [13, с. 126]. З цягам часу палюддзе разглядалася як легітымнае прызнанне вярхоўнай улады князя на тэрыторыю [14, с. 9–11]. Асоба князя, які збіраў пэўную колькасць натуральнага прадукта з падуладнага насельніцтва, успрымалась як неабходная для грамадства і, такім чынам, сакральная. У гэтым выпадку паказальным з’яўляецца функцыянаванне падобнай з’явы ў Скан-

дынаўскіх краінах. Падчас збору вейцлы ў Скандынавіі ў асобе конунга насельніцтва бачыла ўвасабленне дабрабыту краіны. Удзел конунга ў сумесным піры падчас палюддзя быў залогам далейшага росквіту падуладнай яму тэрыторыі [15, с. 184].

**Асноўная частка.** З сярэдзіны IX – пачатку X ст. пачынаецца актыўнае функцыянаванне заходнедзвінскага гандлёвага адрэзку шляху "з вараг у грэкі". Становішча Полацка ў геапалітычнай прасторы Усходняй Еўропы стала адной з галоўных прычын прыходу ў сярэдзіне X ст. на землі крывічоў скандынаўскага конунга Рагвалода.

У гэтай сувязі варта звярнуць увагу на якаснае адрозненне Полацка ад Рурыкава Гарадзішча (Ноўгарада) і Ладагі ў IX–X стст. Калі ініцыятарамі гандлёвых зносін і заснавальнікамі ўмацаваных пунктаў у Ладазе і Рурыкавым Гарадзішчы былі скандынавы, у Полацку раннегарадская структура была заснавана на славянскай аснове [16, с. 44]. Дадзеная акалічнасць, як адзначае Д.У. Дук, "вызначыла своеасаблівасць Полацка ў этнакультурных працэсах Усходняй Еўропы" [17, с. 48].

Археалагічныя дадзеныя сведчаць, што ў Полацкай зямлі X ст. адбываліся істотныя змены, якія маглі быць звязаны з прыходам скандынаваў. З гэтага часу на полацкім гарадзішчы пачынаецца актыўнае фартыфікацыйнае будаўніцтва, што можна ўскосна звязаць з часам усталявання Рагвалода [18, с. 290]. Аб паступовым узрастанні эканамічнай і, разам з ёй, палітычнай магутнасці Полацка ў гэты перыяд сведчыць наяўнасць манетных скарбаў, звязаных з горадам і яго акругай. У 1973 г. у в. Каз'янкі пад Полацкам быў знойдзены скарб арабскіх дырхемаў, які змяшчае 7711 срэбраных куфіцкіх манет [19, с. 72]. Выява на манеце з каз'янкаўскага скарба двузубца, як сімвалічнага знака княжацкай улады, было выканана ў 10–30-я гг. X ст. Таксама сярод графіці, якія былі адбіты на манетах, паводле Е.А. Мельнікавай, значную частку займаюць выявы скандынаўскіх сімвалічных знакаў [20, с. 245]. Часам з'яўлення гэтага скарба ў Полацкай зямлі можна лічыць 30–40-я гг. X ст. Яшчэ адзін клад, які адносіцца да 70–80-х гг. X стст., быў знойдзены ў 1888 г. у іменні Струнь каля Полацка [19, с. 73]. Самым вядомым і значным лічыцца скарб выпадкова знойдзены на тэрыторыі полацкага Ніжняга замка ў 1984 г. Скарб складаецца з 6 залатых прадметаў – шыйных грыўняў і бранзалетаў [21, с. 138; 22, с. 210]. У дадзеным скарбе таксама знойдзены прадметы ўзбраення ў Ніжнім Падзвінні, што сведчыць аб панаванні ўздоўж Заходняй Дзвіны ў першай палове – сярэдзіне X ст. ваенізаванай варажскай арганізацыі на чале з князем, якая з'яўлялася галоўным носьбітам улады ў рэгіёне [18, с. 290].

Паводле звестак Аповесці мінулых часоў у 6488 (980 г.): "*бе бо Рогъволодъ прішелъ и-заморья имяше власть свою в Полотьске а Туръі Турове от негоже и Туровци прозва*" [23, с. 54]. Аб скандынаўскай прыналежнасці першых вядомых князёў Полацка і Турава сведчыць паведамленне, што яны "прыйшлі з-за мора" (Скандынавіі – *Ю.К.*) і скандынаўская этымалогія іх імёнаў. Рагвалод, яго дачка Рагнеда, Тур – славянізаваныя формы скандынаўскіх імёнаў Ragnvaldr, Ragnhildr і Torir.

Імя Ragnvaldr мае адметную этымалогію, якая сведчыць аб яго прыналежнасці да імёнаў, характэрных да эліты скандынаўскага грамадства. Скандынаўскае імя Ragnvaldr складаецца з дзвюх частак. Першая частка "Ragn" даслоўна перакладаецца як "сіла боства", пераклад другой часткі "valdr" гучыць як "уладар" ("улада дадзеная багамі") [24, с. 74]. Значэнне дадзенага імя ўказвае на тое, што яго носьбітам быў прадстаўнік знатнага і магутнага роду, які валодаў уладай.

Усталяванне ўлады Рагвалода ў племянным цэнтры полацкіх крывічоў у сярэдзіне X ст. суправаджалася ўнутрапалітычнай нестабільнасцю на Русі пасля забойства кіеўскага князя Ігара, што магло спрыяць укняжэнню нарманскага ўладара ў Полацку. Горад займаў значнае месца на важнейшым водным шляху. Такім чынам, Полацк з прыходам Рагвалода пачаў кантраляваць выхад на сярэднюю плынь Заходняй Дзвіны, які адкрываў прамы шлях на Балтыку [25, с. 44].

Акрамя лаканічнага паведамлення АМЧ аб факце прысутнасці ў Полацку і Тураве X ст. варажскіх князёў, звестак аб іх дзейнасці больш няма. Летапіс не гаворыць пра характар усталявання ўлады Рагвалода ў Полацку. Аднак на аснове аналізу сацыяльна-палітычных фактараў супастаўленні дзяржаватворчых працэсаў і этнічнай сітуацыі на землях Усходняй Еўропы можна выказаць пэўныя гіпотэзы на гэты конт.

Ва ўмовах барацьбы за кантроль важнейшых адрэзкаў гандлёвага шляху мясцовыя племянныя князі не маюць дастатковых рэсурсаў і магчымасцей, каб аб'яднаць значныя тэрыторыі пад сваёй уладай. У гэтай сувязі прадстаўнікі мясцовых эліт вымушаны запрасіць асобу, якая этнічна не звязана з мясцовым грамадствам.

Згодна з запрашэннем прадстаўнікамі "паўночнай канфедэрацыі плямёнаў" Рурыка з братамі ў Ладагу ў сярэдзіне IX ст. паміж мясцовым набілітэтам і іншаземнай нарманскай дружынай было заключана пагадненне – "рад". Тэрмін "рад" у тэксце легенды аб запрашэнні варагаў указвае, што ва ўспрыняцці летапісца пачатку XII ст. прызванне варажскіх князёў ажыццяўлялася ў адпаведнасці з пэўнымі нормамі права, якія існавалі ў раннесярэднявечным славянскім грамадстве [26, с. 190].

Сітуацыя, якая склалася на землях Прыільмення ў сярэдзіне IX ст., вызначыла ядро легітымізацыі ўлады і далейшыя ўзаемаадносіны князя і асноўнай часткі насельніцтва. Варагі і хазары прадстаўлялі ва

ўсходнеславянскіх землях знешнюю сілу, якая перашкаджала натуральнаму развіццю дзяржаватворчых працэсаў. Кантакты мясцовага насельніцтва славян, фінаў і балтаў з іншаземцамі ў IX ст. часта суправаджаліся ваеннымі выправамі з боку апошніх, рабаваннем, захопам жыхароў і накладаннем даніны. Акрамя гэтага, развіццё дзяржаўнасці спынялі міжэтнічныя супрацьстаянні паміж славянамі і фіна-угорскімі плямёнамі, а таксама міжродавыя спрэчкі ўнутры племянных аб’яднанняў [23, с. 17]. Так, варагі маглі выступаць у якасці арганізуючай знешняй сілы, якую можна выкарыстоўваць для абароны насельніцтва ад нападаў з боку іншаземцаў і гаранта стабільнасці ўнутры грамадства. У выніку на ўсходнеславянскіх землях з’яўляецца дагаварны характар улады [27]. Менавіта дагаворам у Сказанні аб прызванні варагаў тлумачыцца ўзнікненне ўлады Рурыка і ўсталяванне нарманскай дынастыі ў Ладазе і Ноўгарадзе. Варта адзначыць, што ў пазнейшы перыяд асноўнымі абавязкамі князя з’яўляліся функцыі абароны (ваенная) і суда. У гэтай сувязі можна меркаваць, што якасці князя як палкаводца і суддзі выцякаюць з дагаварнога характару ўлады і звязаны з запрашэннем варагаў на ўсходнеславянскія землі.

У сярэдзіне X ст. рэгіён Полацкага Падзвіння апынуўся перад тымі ж праблемамі, перад якімі стаялі паўночныя землі ўсходніх славян сярэдзіны IX ст. Полацк у раннім сярэднявеччы знаходзіўся на мяжы балта-славянскіх кантактаў, як і Наўгародская зямля, якая знаходзілася на мяжы кантактаў славяна-фінскіх. У запрашэнні Рурыка 862 г. прымалі ўдзел як прадстаўнікі славянскіх плямёнаў (славене і крывічы), так і прадстаўнікі фіна-ўграў (чудзь і мера). Летапіснае сказанне аб запрашэнні варагаў гаворыць аб сутыкненнях паміж рознымі этнічнымі групамі. Тое ж самае магло адбывацца і ў Полацку сярэдзіны X ст., калі ў выніку сутыкненняў і канфліктаў паміж крывічамі і балцкімі плямёнамі неабходна было запрасіць трэццю асобу – скандынава Рагвалода [28, с. 104]. Племянному аб’яднанню крывічоў-палачан і балцкім супольнасцям, якія жылі побач, была патрэбна знешняя кіруючыя сіла, якая магла забяспечыць знешнюю бяспеку, унутраную стабільнасць грамадскага жыцця, ахову гандлёвых шляхоў зносін [29, с. 142].

На дагаварны характар усталявання ўлады Рагвалода ў Полацку ўказвае той факт, што, акрамя Рурыка і Рагвалода (магчыма таксама Тура), старажытнарускія крыніцы больш не ўзгадваюць скандынаўскіх уладароў, якія атрымалі ўладу і замацаваліся на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Таму ваенны шлях набыцця ўлады Рагвалодам малаверагодны, бо наступнае афармленне ў Полацкай зямлі ўлады ўнука Рагвалода – Ізяслава – было ажжыцяўлёна непасрэдна пры ўдзеле полацкай знаці, якая, паводле высноў В.М. Ляўко, заключыла з Ізяславам дагавор “ряд” [5, с. 19; 1, с. 45; 30, с. 47;]. Як адзначае даследчыца: “Ряд”, заключаны Ізяславам з мясцовымі “мужами” і “людьми”, прадугледжваў выкананне ім сваіх абавязкаў на карысць Полацкага княства. Гэта ўмова выконвалася ў далейшым і ў адносінах усіх нашчадкаў Рагвалода, якія кіравалі Полацкай зямлёй” [31, с. 397]. Калі ўлічваць, што сацыяльныя інстытуты Полацкай зямлі IX–X стст. былі дастаткова разгалінаваныя і прадстаўнікі мясцовай улады мелі значны ўплыў на грамадства, ваенны захоп Рагвалодам Полацкай зямлі павінен быў прадугледжваць ліквідацыю карэнных сацыяльна-палітычных арганізмаў. З гэтым нельга пагадзіцца. На сённяшні момант вядомы адзінкавыя фрагменты скандынаўскай прысутнасці ў матэрыяльнай культуры Полацка X ст. [32]. Скандынаўскай, паводле свайго этнічнага паходжання, была адносна нешматлікая вайсковая эліта на чале з Рагвалодам. Не вельмі заметная археалагічная прысутнасць у Полацку скандынаваў гаворыць аб тым, што Рагвалоду трэба было абапірацца на мясцовыя сацыяльныя інстытуты з выкананнем пэўных умоў.

Акрамя дамовы паміж славянскай і фіна-ўгорскай знаццю з Рурыкам 862 г., вядомы тыпалагічна падобныя пагадненні паміж уладарамі заходнееўрапейскіх каралеўств і нарманамі канца IX–X стст. [33, с. 35–48]. Дагаворы ўэсэкскага караля Альфрэда Вялікага з правадыром датскага войска ў Англіі Гутрумам, якія былі заключаны першы – у Вэдмары ў 878 г., другі – паміж 878 і 890 гг., вядомы паводле “Хронікі Альфрэда Вялікага”, напісанай Асэрам. Яшчэ адна дамова была заключана Карлам Праставатым у 911 г. у Сен-Клерсюр-Эпт з нарманскім уладаром Роланам (Хрольвам) вядома паводле граматы Карла ад 14 сакавіка 918 г., а таксама звестак шэрагу нарманскіх храністаў.

Звяртаючы ўвагу на тое, што гэтыя дамовы былі заключаны пры розных сацыяльна-палітычных абставінах, яны маюць выразныя тыпалагічныя рысы. Іх аб’ядноўвае факт дамоўных адносін паміж правадырамі скандынаўскіх атрадаў і прадстаўнікамі мясцовых улад. Па сутнасці, усе гэтыя пагадненні легітымізуюць пранікненне і рассяленне вікінгаў на пэўнай тэрыторыі, у выніку чаго ўзнікаюць новыя тэрытарыяльна-палітычныя ўтварэнні. На тэрыторыі Англіі з цягам часу афармляецца незалежная ад Уэсекса вобласць дацкага права – Дэнло, у межах тэрыторыі Францыі, на паўночнай яе часцы, утвараецца герцагства Нармандыя. На тэрыторыі Усходняй Еўропы ўзнікае раннедзяржаўнае аб’яднанне зямель з цэнтрам у Ладазе (ці Рурыкавым гарадзішчы). Адным з галоўных працэсаў, які аб’ядноўвае гэтыя дамовы, з’яўляецца імкненне мясцовых эліт інкарпараваць скандынаваў у сваё грамадства. Таксама пагадненне з Рурыкам прадугледжвала выкананне скандынавам Рурыкам мясцовых норм права, што адлюстравана ў тэрміналогіі летапіснага “Сказання” [26, с. 194].

Рурык запрашаецца “княжить”, “володеть”, “судить” і “рядить” па праву, што абумоўлівае сукупнасць абавязкаў і правоў будучага ўладара паўночнай канфедэрацыі, якія сыходзілі з тых задач, якія імкнулася вырашыць мясцовая племянная эліта з дапамогай запрашэння [26, с. 194]. Як адзначаў У.Ц. Пашута, у дадзеным паведамленніназіраецца імкненне мясцовых эліт да усталявання моцнай улады князя, які бы абараняў інтарэсы не аднаго племяннога аб’яднання, а агульныя інтарэсы рэгіёна [34, с. 103–110].

У Лаўрэнцьеўскім летапісу тлумачыцца, што Рагвалод “*держащю і владеющю Полатьскую землю*” [23, с. 115]. Першы вядомы полацкі князь быў пачынальнікам полацкай княжацкай лініі, а гэта значыць яго падтрымлівала пэўная частка мясцовага грамадства, якую ён абараняў ад знешняй пагрозы і быў ахоўнікам унутранага парадку. Такім чынам, факт укняжэння Рагвалода ў Полацку сярэдзіны Х ст. сведчыць, што ў гэтым рэгіёне дзяржаўная арганізацыя ўзнікла самастойна да яго запрашэння, а далей звязваецца з яго іменем [35, с. 33].

У АМЧ змешчана два паведамленні, у якіх фігуруюць полацкі князь Рагвалод і яго дачка Рагнеда. Летапісны заснавальнік Турава – Тур – узгадваецца аднойчы ў кантэксце першага летапіснага паведамлення аб Рагвалодзе і Рагнедзе: “*а Туръ (ў – Ю.К.) Турове от негоже и Туровци прозваша*” [23, с. 54]. Паведамленне аб князе датычыцца 980 г., але ўжо ў 988 г. тут паводле летапісу княжыць прыемны сын кіеўскага князя Уладзіміра Святаполк. Як пазначае П.Ф. Лысенка: “У раннефеадальным Тураўскім княстве грамадскае развіцце пайшло ўжо далей, і фарміраванне княжацкай улады адбывалася на падставе новай феадальнай структуры грамадства, з фарміраваннем сталай дынастычнай улады” [36, с. 68]. Княжэнне дрыгавічоў змяняецца раннесярэднявечным княствам у выніку адміністрацыйнай рэформы вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. У Тураве князем быў пасаджаны прыёмны сын Уладзіміра Святаполк. Гэтым актам скончылася існаванне княжання дрыгавічоў і быў пакладзены пачатак існаванню Тураўскага княства. У адрозненні ад Полацкага зямлі ў Тураўскім княстве не было сфарміравана адасобленай ад Рурыкавічаў княжацкай дынастыі, і станаўленне княжацкай улады на землях беларускага Палесся звязана з Кіеўскім вялікім князем, якому яна была падпарадкавана.

Скандынаўская дынастыя, пад уладай якой на працягу другой паловы IX–X ст. аказваюцца амаль усе ўсходнеславянскія землі, абапіралася і выкарыстоўвала мясцовыя сацыяльныя інстытуты ў сваіх мэтах і на іншым сацыяльным узроўні. У прыватнасці, гэта паказальна на прыкладзе інстытута палюддзя.

Функцыянаванне палюддзя падчас станаўлення скандынаўскай дынастыі на землях Старажытнай Русі падрабязна апісвае візантыйскі імператар Канстанцін Парфірародны ў трактаце “Аб кіраванні імперыяй” (сярэдзіна X ст.), пры гэтым супрацьпастаўляючы адрасатаў даніны – “росаў” і тых хто яе выплочвае – славян [37, с. 140]. Дзейнасць скандынаўскіх вайсковых атрадаў (росаў) у апісаннях Канстанціна Парфіроднага вельмі блізка карэлюецца з паведамленнямі арабскіх пісьменнікаў канца X ст., дзе гаворыцца аб вылучэнні «знатных русаў» (адасобленага ваеннага слою) і падпарадкаванага насельніцтва – славян (якіх усходнія аўтары называюць «ас-сакаліба»). З славянскага насельніцтва скандынавы спаганяюць даніну [38].

На землях Усходняй Еўропы, у тым ліку і на тэрыторыі Полацкага Падзвіння, у X ст. фарміруецца інстытут княжацкай улады, які заснаваны на скандынаўскай, адасобленай у этнічным плане ад асноўнай часткі насельніцтва аснове. Дадзены фактар садзейнічае элітацызму новай улады, яшчэ большаму ўзвышэнню і адасабленню князя і інстытута дружыны над мясцовым усходнеславянскім грамадствам.

Таксама ў новых ўмовах інстытут палюддзя аказаўся эфектыўным фактарам, які аб’яднаў рознаэтнічныя племянныя саюзы ў адзіную тэрыторыю пад вярхоўнай уладай князя. Аб’езд уладаром і дружынай падуладнай тэрыторыі, хоць і вельмі фрагментарна, але ўжо паступова ствараў абрысы будучых дзяржаўных утварэнняў.

З усталяваннем Рагвалода ў Полацку сярэдзіны X ст. пачынаецца паступовае фарміраванне межаў Полацкай зямлі праз усталяванне княжацкай улады ў аддаленых ад цэнтра (Полацка) землях. У другой палове X ст. пачынаецца рассяленне дружыны ў сельскіх мясцовасцях, аб чым сведчыць узнікненне могільнікаў Банонь і Бельчыца [39, с. 179–196]. Інвентар пахаванняў адпавядае характэрнаму інвентару іншых могільнікаў з дружыннымі пахаваннямі. З’яўленне ў другой палове X ст. каля Полацка насельніцтва з рэчамі старажытнарускага аблічча можна звязаць з прыходам Рагвалода і ўсталяваеннем ім кантролю над гандлёвымі шляхамі па Дзвіне [40, с. 179]. Падобная сітуацыя назіраецца на паўночным усходзе Полацкай зямлі (Вышчадкі) у басейне Дзісны (Чарневічы). Таксама рэгіёны, дзе знойдзены ў пахаваннях статусныя рэчы, уключае вярхоўя Бярэзіны Дняпроўскай (Бірулі, Вітунічы), Ушачы Дзвінскай (Рыбакі, Селішча, Славены) і Віліі Нёманскай (Ізбішча) [40, с. 180]. Амаль усе пахаванні адносяцца да другой паловы X – пачатку XI ст., што гаворыць аб працэсе ўключэння гэтых тэрыторый у сферу інтарэсаў Полацка.

Працэс падпарадкавання зямель балтаў і асобных славянскіх племянных утварэнняў, паводле археалагічных матэрыялаў, суправаджаўся ваенным шляхам. У выніку археалагічных даследаванняў на лукомльскім гарадзішчы (цэнтра племені “лукамлян”) на ім даволі поўна прадстаўлены перыяд X–XI стст. [41, с. 143]. Да гэтага часу належаць ланцэтавідныя наканечнікі стрэл, з’яўленне якіх Г.В. Штыхаў звязвае з дзейнасцю варагаў [42, с. 54; 43, с. 12–13]. Таксама наяўнасць слядоў пажара X ст.

на ўмацаваным гаразішчы Лукомля [44, с. 111] сведчыць аб уключэнні дадзенай тэрыторыі ў склад Полацкага княства [45, с. 27].

У могільніку Замошша, што знаходзіцца ў наваколлі Лукомля, вылучаецца пахаванне з элементамі наборнага поясу X ст., што з'яўляецца паказчыкам высокага сацыяльнага статусу пахаванага і прыналежнасці яго да дружыны або княжацкай адміністрацыі. Верагодна, пасля ваеннага падпарадкавання лукомльскага княжэння на гэтай тэрыторыі была размешчана адміністрацыя полацкага князя, якая займалася адміністрацыйным кіраваннем: зборам даніны, выкананнем судовых і адміністрацыйных функцый. Прысутнасць у раёне Лукомля пахавання чалавека з высокім сацыяльным статусам, які быў пахаваны па абрадзе больш характэрным для Полацкага Падзвіння, адлюстроўвае працэсы, звязаныя са стварэннем дзяржаўнага ўтварэння з цэнтрам у Полацку.

Паводле археалагічных даследаванняў М.А. Плавінскага ў другой палове X ст. на тэрыторыі Браслаўскага Паазер'я (ваколіца азёр Укля – Абстэрна – Важа) з'яўляюцца курганныя могільнікі, якія атаясамліваюцца з прытокам новага насельніцтва з больш усходніх рэгіёнаў беларускага Падзвіння [46, с. 129]. Паводле часу з'яўлення новага насельніцтва на ўсходзе Браслаўскага Паазер'я можна меркаваць аб паступовым пранікненні прадстаўнікоў полацкай княжацкай улады ў гэты рэгіён. Знойдзеныя ў могільніках богінска-дрывятскага мікрарэгіёна прадметы ўзбраення старажытнарускіх і паўночнаеўрапейскіх формаў (сякеры, ланцэтавідныя наканечнікі коп'яў з "гатычным" арнаментам), якія датуюцца X – першай паловай XI ст. [46, с. 131], таксама могуць быць пахаваннямі полацкай княжацкай адміністрацыі. З дзейнасцю прышлага насельніцтва ў Браслаўскім Паазер'і варта звязваць і могільнік Пагошча, да якога належаць 10 кurганоў, якія таксама інтэрпрэтаваны М.А. Плавінскім як пахаванні прадстаўнікоў полацкай княжацкай улады [46, с. 131].

Працэсы распаўсюджвання прадметаў старажытнарускага і паўночнаеўрапейскага паходжання празрыста ўказваюць на пашырэнне княжацкай улады з цэнтрам у Полацку на пery-ферыйныя тэрыторыі ад наваколляў Лукомля на паўднёвым усходзе, да Браслаўскага Паазер'я на паўночным захадзе. Працэс "акняжэння" тэрыторый часта суправаджаўся ваенным шляхам, аб чым свед-чаць сляды пажараў на гарадзішчы Лукомля, гарадзішча "Замак" на возеры Дрысвяты і на гарадзішчы "Замкавая гара" ў Браславе [47, с. 103]. На тэрыторыі, якія былі ўключаны ў сферу інтарэсаў Полацкай зямлі, распаўсюджвалася даніна. Аб існаванні інстытута палюддзя сярод першых полацкіх князёў ускосна сведчыць тапонім *Палюдавічы* на мяжы Полацкага і Міёрскага раёнаў.

У сярэдзіне – другой палове X ст. на тэрыторыі Полацкага Падзвіння ўтвараецца самастойная тэрытарыяльна-палітычная арганізацыя, заснаваная на скандынаўскай уладзе скандынаўскага конунга Рагвалода пры актыўнай ролі ў грамадскім жыцці прадстаўнікоў мясцовай знаці. Паводле вызначэння Г.М. Семенчука, дадзенае ўтварэнне ("княжэнне Рагвалода") было тыпалагічна падобна на "варварскія каралеўствы" Заходняй Еўропы V–VIII стст. [48, с. 69].

Канец X ст. звязаны з цэнтралізацыяй улады на ўсходнеславянскіх землях. Гэты складаны працэс быў звязаны з дзейнасцю кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. Распаўсюджанне ўлады кіеўскага князя на тэрыторыю Полацкай зямлі адлюстравалася ў летапісным паведамленні аб заваёве Полацка Уладзімірам 980 г. Летапісная легенда аб сватанні Уладзіміра да Рагнеды і паходзе кааліцыі паўночных плямёнаў на Полацк захавалася ў Пачатковым летапісе пад 6488 (980) г. Паведамленне аб паходзе Уладзіміра і Дабрыні на Полацк, згодна з высновамі А.А. Шахматава, мае характар устаўкі. Рабаванне горада, на думку даследчыка, адносіцца да больш ранняга часу (пачатак 970-х гг.), што лагічна зрушвае перыяд укняжэння Рагвалода ў Полацку на сярэдзіну X ст. [49, с. 118]. Галоўнай мэтай паходу Уладзіміра, такім чынам, было падпарадкаванне Полацка і кантраляванне гандлёвага шляху па Дзвіне, або перакрыццё гэтага шляху на карысць Ноўгарада, што абумовіла далейшае актыўнае супрацьстаянне двух гарадоў у XI ст.

Рабаванне Полацка і фізічнае знішчэнне Рагвалода і яго сыноў пераследавала мэты распаўсюджвання кіеўскай улады на незалежныя ад Кіева цэнтры – Полацк і, магчыма, Тураў. З дзейнасцю Уладзіміра звязана прызнанне роду Рурыкавічаў адзіным легітымным прадстаўніком улады на Русі.

**Заключэнне.** Напярэдадні прыходу ў Полацк Рагвалода на тэрыторыі Полацкага Падзвіння існавала сістэма ўлады, якая гуртавалася на ўладзе мясцовых правадыра(оў) пры вялікім уплыве на грамадскае жыццё набілітэту (полацкага баярства). Актыўнае функцыянаванне заходнедзвінскага маршруту "з вараг у грэкі" з'явілася адной з асноўных прычын усталявання ў Полацку ўлады Рагвалода. К сярэдзіне X ст. мясцовыя племянныя князі не мелі значных сіл і рэсурсаў для ажыццяўлення кантролю над полацкім гандлёвым маршрутам. Укняжэнне Рагвалода ў Полацку адбылося па ініцыятыве мясцовых палітычных эліт шляхам пагаднення "ряда" паміж скандынаўскім уладаром і мясцовым набілітэтам. У гэтай сувязі ўмацаванню ўлады Рагвалода ў Полацкай зямлі садзейнічала агульнасць інтарэсаў мясцовых эліт і інтарэсаў скандынаваў. Умовамі ўкняжэння Рагвалода было выкананне функцый кантролю над сярэднедзвінскім гандлёвым маршрутам "з вараг у грэкі". Відавочна, што дадзенае кіраўніцтва ажыццяўлялася пад непасрэдным уплывам мясцовай арыстакратыі. Кантроль над сэрэднеднедзвінскім напрамкам даваў значнае матэрыяльнае ўзбагачэнне як княжацкай уладзе, прадстаўленай

скандынавам Рагвалодам, так і племяннной эліце. Таксама "ряд", заключаны прадстаўнікамі мясцовай знаці з Рагвалодам, як правадыром аднаго са скандынаўскіх атрадаў, прадугледжваў наданне яму ў якасці князя вярхоўнай улады з мэтай абароны ад знешняй пагрозы і забеспячэння інтарэсаў племянных эліт на ўмовах захавання мясцовых нормаў звычаёвага права. Падпарадкаванне навакольных тэрыторый ад Браслаўскага Паазер'я да Лукомля і Друцка ў другой палове X ст., устанаўленне з насельніцтвам гэтых тэрыторый налогава-данніцкіх адносін спрыялі паступоваму станаўленню княжацкай адміністрацыі і распаўсюджванню ўлады полацкага князя. Такім чынам, асаблівасці ўсталявання ў Полацку ўлады Рагвалода, а менавіта верагоднага пагаднення, заключанага скандынаўскім уладаром з мясцовымі элітамі, абумовілі далейшы працэс станаўлення самастойнай полацкай княжацкай дынастыі Рагвалодавічаў і адметнае гістарычнае развіццё Полацкай зямлі на працягу XI–XII стст.

ЛІТАРАТУРА

1. Левко, О.Н. Племенные структуры, погосты и волости Витебского Подвинья в конце I-го – начале II тысячелетия / О.Н. Левко // Учёные записки Витебского ун-та. – 2003. – Т. 2. – С. 31–49.
2. Oberg, K. Types of Social Structure among the Lowland Tribes of South and Central America / K. Oberg // American Anthropologist, 1955. – 488 s.
3. Service, E.R. Origins of the State and Civilization. The Process of Cultural Evolution. / E.R. Service. – N.Y., 1975. – 115 s.
4. Данилевский, И.Н. Древняя Русь глазами современников и потомков (IX–XII вв.) / И.Н. Данилевский. – М. : Аспект пресс, 1998. – 205 с.
5. Ляўко, В. Раннесярэднявечнае грамадства на тэрыторыі Беларусі (структура, службыя арганізацыі, павіннасці) / В. Ляўко // Штогоднік Інстытута гісторыі Нац. Акадэміі навук Беларусі. – Мінск : Ін-т гісторыі, 1999. – С. 17–25.
6. Пъянков, А.П. Происхождение общественного и государственного Строя Древней Руси / А.П. Пъянков. – Минск : Изд.-во БГУ, 1980. – 208 с.
7. Левко, О.Н. Формирование землевладельческих структур / О.Н. Левко // Беларусь: народ, государство, время. – Минск : Беларус. Навука, 2009. – С. 381–383.
8. Мельникова, Е.А. К типологии предгосударственных и раннегосударственных образований в Северной и Северо-Восточной Европе (Постановка проблемы) / Е.А. Мельникова // Древняя Русь и Скандинавия : избр. Тр. – М. : Русский Фонд Содействию образования и Науке, 2011. – С. 15–34.
9. Полюдье: всемирно-историческое явление. – М. : Российская политическая энциклопедия, 2009. – 791 с.
10. Темушев, С.Н. Налогово-данническая система древнерусского государства: современное понимание проблемы / С.Н. Темушев // Российские и славянские исследования : науч. сб. – Минск : БГУ, 2007. – Вып. 2. – С. 106–112.
11. Фроянов, И.Я. Рабство и данничество у восточных славян (VI–X вв.) / И.Я. Фроянов. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 1996. – 512 с.
12. Гуревич, А.Я. Избранные труды. Древние германцы. Викинги / А.Я. Гуревич. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2007. – 352 с.
13. Темушев, С.Н. Налоги и дань в Древней Руси / С.Н. Темушев. – Минск : БГУ, 2015. – 279 с.
14. Темушев, С.Н. Генезис и эволюция института верховной власти в славянских раннефеодальных государствах (VII–XII вв.) : автореф. дис.... канд. ист. наук / С.Н. Темушев ; Бел. гос. ун-т., 2003. – 20 с.
15. Гуревич, А.Я. Избранные труды. Норвежское общество в раннее средневековье / А.Я. Гуревич. – М. : Изд-во «Традиция», 2009. – 470 с.
16. Дук, Д.У. Феномен станаўлення дзяржаўнасці на землях полацкіх крывічоў (IX–XI стст.) / Д.У. Дук // Спадчына. – 2003. – № 6. – С. 40–46.
17. Дук, Д.В. Заурядный городок, затаившийся в речных излучинах? Новая концепция роли и места Полоцка в ранней древнерусской истории / Д.В. Дук // Родина. – 2013. – № 6. – С. 47–49.
18. Русь в IX–XI веках : археологическая панорама / Ин-т археологии РАН ; отв. ред. Н. А. Макаров. – М. ; Вологда : Древности Севера, 2012. – 496 с. : ил.
19. Рябцевич, В.Н. О чем рассказывают монеты / В.Н. Рябцевич. – Минск : Народная асвета, 1977. – 399 с. : ил.
20. Мельникова, Е.А. К вопросу о происхождении знаков Рюриковичей / Е.А. Мельникова // Древняя Русь и Скандинавия : избр. тр. – М. : Русский Фонд Содействию образования и Науке, 2011. – С. 241–248.
21. Археалогія Беларусі : у 4 т. / Я.Г. Звяруга [і інш.] ; навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – Т. 3. Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.). – 554 с. : іл.
22. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.). – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л – Я. – 464 с. : іл.
23. Полное собрание русских летописей. – Л. : Изд-во Академии наук СССР, 1926–1928 . – Т. 1. Лаврентьевская летопись. – 379 с.
24. Самонова, М.Н. Рогьволодъ – Ragnvaldr: к вопросу о возможной идентификации / М.Н. Самонова // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 22–23 мая 2012 г. – Минск : Беларус. навука, 2012. – С. 73–78.
25. Темушев, С.Н К вопросу об истоках политической самостоятельности Полоцкой земли в древнерусский период / С.Н. Темушев // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы міжнар. навук. канф., Полацк, 22–23 мая 2012 г. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі, Полац. дзярж. ун-т. ; навук. рэд., уклад. В.М. Ляўко – Мінск, 2012. – С. 39–51.
26. Мельникова, Е.А., Петрухин, В.Я. «Ряд» легенды о «призвании варягов» и становление древнерусской историографии / Е.А. Мельникова, В.Я. Петрухин // Древняя Русь и Скандинавия: Избранные труды. – М. : Русский Фонд Содействию образования и Науке, 2011. – С. 190–200.

27. Соловьев, К.А. Эволюция форм легитимации государственной власти в древней и средневековой Руси. IX – первая половина XIV вв. [Электронны рэсурс] / К.А. Соловьев. – Рэжым доступу: http://krotov.info/history/09/3/solo1999.html. – Дата доступу: 07.07.2012.

28. Кежа, Ю.М. Устанаўленне княжацкай улады ў Полацку (IX–X стагоддзі) / Ю.М. Кежа // Труды молодых специалистов Полоц. гос. ун-та. – Новополоцк, 2009. – Вып. 34. – С. 103–105.

29. Новікаў, Я.У. Ваенная гісторыя беларускіх земляў (да канца XII ст.) / Ягор Новікаў. – Мінск : Логвінаў, 2006. – Т. 1. – 208 с.

30. Левко, О.Н. Полоцкое княжество / О.Н. Левко // Беларусь: народ, государство, время. – Минск : Беларус. навука, 2009. – С. 45–51.

31. Левко, О.Н. Социальные институты IX – начала XI в. / О.Н. Левко // Беларусь: народ, государство, время. – Минск: Беларус. Навука, 2009. – С. 377–380.

32. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с., іл.

33. Мельникова, Е.А. Возникновение Древнерусского государства и скандинавские политические образования в Западной Европе (сравнительно-типологический аспект) / Е.А. Мельникова, В.Я. Петрухин // Древняя Русь и Скандинавия : избр. тр. – М. : Русский Фонд Содействию образования и Науке, 2011. – С. 35–48.

34. Пашуто, В.Т. Летописная традиция о «племенных княжениях» и варяжский вопрос / В.Т. Пашуто // Летописи и хроники. – М., 1974. – С. 103–110.

35. Штыхаў, Г.В. Полацкае княства – калыска дзяржаўнасці на беларускіх землях / Г.В. Штыхаў // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 22–23 мая 2012. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – С. 31–38.

36. Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX–XIII вв. / П.Ф. Лысенко. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 268 с., ил.

37. Древняя Русь в свете зарубежных источников : хрестоматия / под ред. Т.Н. Джаксон, И.Г. Коноваловой и А.В. Подосинова. – М. : Русский Фонд Содействия Образованию и Науке, 2010. – Т. II : Византийские источники / сост. М.В. Бибиков. – 384 с.

38. Древняя Русь в свете зарубежных источников : хрестоматия / под ред. Т.Н. Джаксон, И.Г. Коноваловой и А.В. Подосинова. – М. : Русский Фонд Содействия Образованию и Науке, 2009. – Т. III : Восточные источники / сост. Ч. I – Т.М. Калинина, И.Г. Коновалова ; Ч. II – В.Я. Петрухин. – 264 с.

39. Ляўданскі, А.Н. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе / А.Н. Ляўданскі // Зап. Аддз. Гуманіт. Навук. – Менск, 1930. – Кн. II : Працы археалагічнай камісіі. Т. II. – С. 179–196.

40. Вайцяховіч, А. Змены ў абрадзе крэмацыі на тэрыторыі Полацкай зямлі ў X ст. / А. Вайцяховіч // Актуальныя праблемы ранняй гісторыі славян : зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 верас. 2009 г. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 178–184.

41. Штыхаў, Г.В. Крывічы: па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Г.В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 191 с.: іл.

42. Штыхов, Г. Древний Лукомль – материальная культура в этническом аспекте (I тысячелетие н.э.) / Г. Штыхов // Актуальныя праблемы ранняй гісторыі славян : зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 верас.2009 г. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 45–59.

43. Штыхов, Г.В. Лукомль: археологический комплекс железного века и средневековья / Г.В. Штыхов. – Минск : Беларус. навука, 2014. – 167 с. : ил.

44. Еремеев, И. Древний Лукомль. Лепная керамика и раннесредневековый культурный слой / И. Еремеев, Г. Штыхов // Acta Archaeologica Albaruthenica. – 2011. – Vol. I (Вып. 1). – С. 110–134.

45. Левко, О.Н. Полоцкая земля в государствообразующих процессах Восточной Европы IX–XII вв. / О.Н. Левко // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 22–23 мая 2012 г. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – С. 22–30.

46. Плавінскі, М. Насельніцтва Браслаўскага Паазер'я ў другой палове I – пачатку II тысячагоддзя н.э. (па матэрыялах пахавальных помнікаў) / М. Плавінскі // Актуальныя праблемы ранняй гісторыі славян : зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 верас. 2009 г. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 126–137.

47. Алексеев, Л.В. Раскопки древнего Браслава / Л.В. Алексеев // КСИА. – 1960. – Вып. 81. – С.95–106.

48. Семянчук, Г.М. Пачатковы этап фарміравання Полацкай зямлі (IX–X стст.) / Г.М. Семянчук // Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамадскіх навук. – 1991. – № 3. – С. 69–74.

49. Шахматов, А.А. Разыскания о русских летописях / А.А. Шахматов. – М. : Академический проект, Жуковський : Кучково поле, 2001. – 880 с.

*Паступіў 14.12.2016.*

## FORMATION OF AUTHORITIES ROGVOLOD IN SOCIAL RELATIONS POLOTSK

***J. KEZHA***

*The article analyzes the characteristics of the establishment in Polatsk of Scandinavian leader Rogvolod power (mid-tenth century till 978). It is concluded that Rogvolod was invited to Polotsk by representatives of local elites in the middle of the tenth century. Power factor was Rogvolod perform their oversight functions over the Polotsk trade route and the protection of the territory from external threats. Under Rogvolod power in the second half of the tenth century were large areas. With a population of these territories the tax relations were established.*

***Keywords**: Polatsk, Rogvolod, power.*